ПРАЛЕТАРЫ УСЁХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Органа гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 82 | НЯДЗЕЛЯ, 9 КРАСАВІКА 1933 г. | № 82

З НОВЫМ КАЛДАГАВОРАМ— НА ДАЛЕЙШЫ ЎЗДЫМ!

Калдагаворная кампанія 1933 году—першага году другой сацыялістычнай пяцігодкі—па буйных і наогул па большасьці прадпрыемстваў Віцебску скончылася. Зараз мы можам зрабіць папярэднія вынікі гэтай важнейшай палітычнай кампаніі і ў сьвятле гэтых вынікаў намеціць новыя задачы па ажыцьцяўленьні кожнага пункту новага калдагавору.

Раней за ўсё трэба падкрэсьліць, што там, дзе гэтую кампанію—кампанію перазаключэньня калдагавораў—перавялі ў масавую, там, дзе растлумачылі кожнаму рабочаму гаспадарча-палітычную сутнасьць калдагавору, як духбаковага абавязацельства, там мы маем поўныя зрухі у выказаньні прамфінпляну. На фабрыцы «Дзьвіна» ў дні калдагавор паступіла 500 прапаноў; у цэхах рабочыя правярялі выкананьне старога калдагавору і ў выніку маем, што фабрыка за сакавік выканала плян на 104,6 процанта, патрэбна адзначыць рост крывой выкананьня пляну ў час заключэньня дагавору: за першую пяцідзёнку сакавіка плян выканан на 96,58 проц., за другую —100,84 проц., за пятую пяцідзёнку плян выканан на 123 проц. Адгэтуль яскрава, што праведзена масавая работа, што вышэй узьнята сацспаборніцтва, узьняты творчы ўздым саміх рабочых.

На панчошнай імя Цэткін у час калдагаворнай палепшылася якасьць прадукцыі. Лепшыя брыгады Гольдзінай, Арэніна, Красільчыкавай сваёй ударнай работай зьнялі процант штопкі. На „Сьцягу індустрыялізацыі“ з вялікай актыўнасьцю прайшлі цэхавыя канфэрэнцыі. Перадовыя гаспразрахунковыя брыгады Ленкевіча, Янавіцкага і Раманава першымі на фабрыцы выступілі супроць заніжаных норм і сваім прыкладам даказалі рабочым, што іх нормы зьлўляюцца тэхнічна неабгрунтаванымі і таму яны далі сустрэчныя, зусім рэальныя нормы. На акулярнай фабрыцы, на «Прафінтэрне», на фабрыцы імя Лекерта перадавыя ўдарнікі таксама падхапілі ініцыятыву брыгад «Сьцягу» і ўзьнялі свой пралетарскі голас супроць заніжаных норм. І, урэшце, ударнікі скурзаводу т. т. Іваноў і Бураўкін даказалі рэальнасьць новых тэхнічна-абгрунтаваных норм і праз нашу газэту выступілі з паказам опыту сваёй работы. Такім чынам, усё гэта красамоўна гаворыць, што калдагаворная першага году другой пяцігодкі па большасьці прадпрыемстваў узьняла новую хвалю творчага ўздыму і энтузыязму, накіраваную на ажыцьцяўленьне грандыёзных задач другой пяцігодкі.

І вусім зразумела, што ў час калдагаворнай—важнейшага зьвяна барацьбы за бальшавіцкі плян—актывізавалі сваю дзейнасьць клясава чуждыя элементы на прадпрыемствах. Клясавы вораг у рабочай блюзе зьмяніў сваю тактыку: ён пачаў скрываць сваю прадукцыйнасьць ля арштату з тым, каб дамагацца яшчэ большага зьмяншэньня норм выпрацоўкі, нават супроць заніжаных, клясавы вораг выступаў супроць новых норм, актывізуючы вацтва, узьдзейнічаючы на адсталыя пласты рабочых. Гэтая тактыка клясавага ворага найбольш была бачна на акулярнай і абутковай імя Лекерта.

У адказ на гэтыя клясава-варожыя вылазкі ўзьнімалася рэвалюцыйная клясавая пільнасьць рабочых мас, якія далі рашучы бальшавіцкі адпор клясавым ворагам, іх агентуры, мабілізуючы масы на барацьбу за прадукцыйнасьць працы.

Аднак, нельга не адзначыць, што арганізацыі раду прадпрыемстваў і ўстаноў (шчаткомб, база Белутылю, гарадзкое харчаваньне і інш.) не зразумелі, што новы калдагавор—выкачаньне прамфінпляну, яго якасныя паказчыкі. Для таго, каб выканаць плян неабходна ўзьняць прадукцыйнасьць працы, добрасумленна адносіцца да працы, кіраваць сапспаборніцтвам і ўдарніцтвам, зьнішчыць унутрыцэхавыя непаладкі, прастоі, правільна арганізаваць і расставіць людзей. Для таго, каб назаўсёды пакончыць з перавыдаткаваньнем фондаў зарплаты—трэба канчаткова зьнішчыць «лявацкую» ўраўнілаўку, трэба палепшыць тэхнармаваньне, асвойваючы новыя нормы і далей будуючы іх на аснове тэхнічнага абгрунтаваньня. Трэба таксама пакончыць з раздуваньнем штатаў.

Нашы віцебскія прадпрыемствы ня могуць ганарыцца сёньня тым, што яны маюць эрух у рэалізацыі паказаньняў тав. Сталіна аб асваеньні новых прадпрыемстваў. Наадварот, абутковая імя Лекерта мае ў сваім пасыўным балянсе перавыдатак фондаў зарплаты за студзень і люты на 31.000 руб. Панчошная імя КІМ мае за гэтыя месяцы перавыдатак у суме 47.000 руб., лесазавод імя «Правды» —17.000 руб.

Стала быць, задача заключаецца ў тым, каб з першага ж дню ўступленьня ў моц новага калдагавору і гаспадарнікі, і фабзавкомы, і рабочыя пачалі работу па ператварэньні ў жыцьцё кожнага пункту новага калдагавору 1933 году.

Ад прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый патрабуецца ажыцьцявіць рабочыя прапановы, сабраныя ў час калдагаворнай, перабудаваць работу ТНБ, перанёсшы цэнтр іх работы ў цэх, у брыгаду.

Рабочыя ўдарнікі! Ператворым новыя калдагаворы ў магутныя вагары ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы, палепшаньня якасьці прадукцыі, зьніжэньня сабекаштоўнасьці! Прыдзем да 1-га мая—інтэрнацыянальнага сьвята ўсіх працоўных усяго сьвету—з бальшавіцкімі паказчыкамі выкананьня нашых бальшавіцкіх плянаў.

УЧОРА НА СХОДЗЕ ПАРТАКТЫВУ ВЫСТУПІЎ тав. ГІКАЛО.

Учора ў Белдзяржтэатры адбыўся сход гарадзкога партактыву.

На сходзе з вялікім дакладам аб веснавой сяўбе і задачах КП(б)Б выступіў першы сэкратар ЦК КП(б)Б т. ГІКАЛО.

Сход партактыву сустрэў т. Гікало бурнымі авацыямі.

Дружныя, доўга незмаўкаючыя воплескі ўсяе залі пакрылі апошнія словы дакладу першага сэкратара ЦК.

Пасьля дакладу адбыліся спрэчкі. Сход прыняў рэзалюцыю па дакладзе.

Падрабязная інфармацыя аб сходзе партактыву будзе зьмешчана ў адным з бліжэйшых нумароў газэты.

АБ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОВЫ САКАВІЦКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б ПА НАЦПЫТАНЬНІ.

Пастанова аб'яднанага пленуму гаркому і гарКК КП(б)Б ад 2-га красавіка.

Аб'яднаны пленум гаркому і гарКК КП(б)Б сумесна з партактывам цалкам і поўнасьчю адабрае пастановы сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б і бюро ЦК, ліст т. т. Гікало і Галадзеда ў «Правду» аб становішчы і практыцы правядзеньня нацпалітыкі партыі ў Беларусі, якія мабілізуюць партарганізацыю на хутчэйшае выпраўленьне ізврашчэньняў ленінскай нацпалітыкі і на сапраўды бальшавіцкую барацьбу за яе ажыцьцяўленьне.

Выкрытыя пры дапамозе ЦО КП(б)Б „Зьвязды“ факты ізврашчэньня практыкі правядзеньня нацпалітыкі ў Віцебшчыне з усёй яскравасьцю сьведчаць, што віцебская партарганізацыя, нягледзячы на неаднаразовыя паказаньні з боку ЦК КП(б)Б, не вяла «бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму і ў радзе выпадкаў патурала буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям». Адсутнасьць канкрэтнага, сыстэматычнага і апэрацыйнага кіраўніцтва правядзеньнем нацпалітыкі, у прыватнасьці беларусізацыі, нанёсьць фактаў мэханічнага правядзеньня яе, слабая работа па бальшавіцкім выхаваньні як усёй партарганізацыі, так і актыву, страта па сутнасьці ў асобных зьвеньнях партарганізацыі рэвалюцыйнай пільнасьці да новых ма нэўраў клясавага ворага, зусім слабая работа сярод працоўных нацменшасьцяў і г. д.—прывялі да глыбокіх прарываў і ізврашчэньняў у практыцы правядзеньня нацпалітыкі на Віцебшчыне.

Пленум гаркому і гарКК прызнае кіраўніцтва практыкай правядзеньня нацпалітыкі, як з боку бюро гаркому і прэзыдыуму ГКК, так і з боку парткалектываў і ячэек, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый раёну — нездавальняючым.

Выходзячы з вышэйпаказанага, аб'яднаны пленум ГК і гарКК пастанаўляе:

1. Зацьвердзіць пастановы бюро гаркому і прэзыдыуму гарКК аб выпраўленьні дапушчаных у асобных зьвеньнях партарганізацыі ізврашчэньняў у практыцы правядзеньня нацпалітыкі, і ў прыватнасьці, беларусізацыі.

Адобрыць мерапрыемствы ГК па шырокай і масавай прапрацоўцы пастаноў сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б, лісту т. т. Гікало і Галадзеда ў „Правду“ і рашэньняў бюро і пленуму ГК і ГКК КП(б)Б па нацпытаньні ў партыйнай, камсамольскай арганізацыі, сярод рабочых і калгасных мас. Даручыць культпропу ГК правесьці спэцыяльны 2-дзёньнік абавязковай вучобы кіруючага актыву раёну па распрацоўцы асноў вучэньня марксызму-ленінізму па нацпытаньні.

2. Пленум лічыць, што ў працы гарКК ня было сыстэматычнай і апэрацыйнай работы па ажыцьцяўленьні нацпалітыкі, справы па ізврашчэньні практыкі правядзеньня нацпалітыкі ня ўздымаліся на палітычную вышыню і гэтым самым не мабілізоўвалася і ня выхоўвалася партарганізацыя на сапраўдна бальшавіцкае ажыцьцяўленьне нацпалітыкі. У пастанове парткалегіі гарКК ад 14 сьнежня 32 г. па абгляде чатырох прадпрыемстваў, пры завайстрэньні ўвагі на барацьбу з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму і правядзеньне інтэрнацыянальнага выхаваньня, упушчаны паказаньні аб барацьбе з нацдэмакратызмам, шавінізмам іншых колераў.

Абавязаць прэзыдыум гарКК пабудаваць сваю работу так, каб на падставе ўскрыцьця кожнага факту ізврашчэньняў у нацпалітыцы выхоўвалася ўся партарганізацыя ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізму.

3. Пленум канстатуе наяўнасьць у асобных зьвеньнях партарганізацыі нацыяналістычных элемэнтаў, пратасківаючых буржуазна-кулацкія контррэвалюцыйныя тэндэнцыі, ідэалізуючых дробнабуржуазныя, контррэвалюцыйныя арганізацыі (Бунд, Грамада і інш.), выкрыцьцё і разаблачэньне якіх пастаўлены нездавальняюча, налічча раду фактаў прыкрыцьця антыпартыйных дзеяньняў фальшыва-нацыянальным сьцягам (справа Багатырова, Былюціна, Баброва).

Пленум патрабуе ад усёй партарганізацыі самага рашучага выкрыцьця і разаблачэньня клясава-варожых, нацыяналістычных элемэнтаў, прыкрываючыхся фальшыва-нацыянальным сьцягам, на справе праводзячы барацьбу на два франты ў нацпытаньні—супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, і супроць ухілаў у бок мясцовага нацыяналізму. Разам з тым пленум рашуча папярэджвае партарганізацыю супроць мэханічнага падыходу і голага адміністраваньня ў правядзеньні ўсёй работы, зьвязанай з практыкай ажыцьцяўленьня нацпалітыкі і яе сустаўной часткі—беларусізацыі.

4. Пленум адзначае, што пасьлі вусім выразнага паказаньня студзеньскага пленуму ГК аб выключна слабым удзеле камсамольскай арганізацыі ў нацкультбудаўніцтве, гарком КСМ не забясьпечыў караннога пералому ў рабоце па ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі і інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўнай моладзі, пленум абавязвае ГК КСМ у пяцідзённы тэрмін прадставіць на зацьвярджаньне бюро гаркому свае канкрэтныя мерапрыемствы ў гэтай галіне.

5. Абавязаць парткалектывы і ячэйкі, савецкія, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі ажыцьцяўленьне нацпалітыкі правядзіць пад пунктам гледжаньня мабілізацыі мас на выкананьне задач першага году другой бальшавіцкай пяцігодкі, на аўладаньне новымі прадпрыемствамі, пабудаванымі пры непасрэднай дапамозе Савецкага саюзу, на выкананьне прамфінпляну, бальшавіцкае правядзеньне веснавой сяўбы, на барацьбу за ператварэньне калгасаў у сапраўды бальшавіцкія калгасы, першачарговае выкананьне ўсіх абавязкаў перад дзяржавай, вядучы бязьлітасную барацьбу з расхлабанасьцю, месьніцкімі тэндэнцыямі, рвацтвам, пад прыкрыцьцём фальшыва-нацыянальнага сьцягу.

6. Бюро гаркому, прэзыдыуму ГКК і ўсім мясцовым арганізацыям правесьці на працягу красавіка далейшую работу па праверцы кадраў і ачыстцы ўсіх зьвеньняў савецкіх, гаспадарчых і культурных устаноў і арганізацый ад перараджэнцкіх, гнілых, антысавецкіх, нацыяналістычных элемэнтаў, замяніўшы іх праверанымі работнікамі. Адначасова пленум папярэджвае, што «пры гэтай праверцы не павінны быць дапушчаны перагібы ў адносінах тых работнікаў (савецкіх, гаспадарчых, культурных і інш.), якія добрасумленна праводзяць у сваёй рабоце палітыку савецкай улады і партыі і дапусьцілі толькі асобныя памылкі, імі ўсьвядомленыя і на справе выпраўленыя».

Абавязаць аргаддзел і аддзел кадраў ГК у 2-дэкадны тэрмін правесьці праверку становішча работы па прасоўваньні і вылучэньні рабочых з каранных нацыянальнасьцяў, у асаблівасьці беларусоў, на кіруючыя работы; унесьці к 20 красавіка свае прапановы на бюро гаркому.

7. Адзначаючы рад фактаў контррэвалюцыйных, кулацкіх, нацыяналістычных вылазак сярод студэнцтва і навуковых работнікаў (кіно тэхнікум, вэткамбінат) і адсутнасьць сапраўднай барацьбы з імі з боку партарганізацый навучальных устаноў і асобных камуністаў—навуковых працаўнікоў недастатковую забясьпечанасьць вядучай ролі камуністаў на тэаратычным і ідэалёгічным фронце, пленум патрабуе прыняцьця мер па ўзмацненьні гэтага важнейшага участку партыйнай работы, для чаго:

а) забясьпечыць з боку партарганізацый навучальных устаноў сыстэматычнае вывучэньне сацыяльнага складу студэнцтва, рашуча ачышчаючы навучальныя ўстановы ад пралезных у іх клясава-варожых элемэнтаў;

б) Культпропу ГК правесьці праверку праграм і заданьняў, у першую чаргу па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах, у ВУЗ'ах і тэхнікумах;

в) узмацніць асобныя ВУЗ'ы, тэхнікумы, школы вытрыманымі партыйнымі кадрамі; культпропу ГК пераглядзець нагрузкі і скарыстаньне навуковых работнікаў, забясьпечыўшы павышэньне вядучай ролі камуністаў--навуковых работнікаў на тэарэтычным фронце;

г) аргаддзелу ГК у красавіку правесьці нарады бюро парт'ячэек паасобна вузаўскіх і тэхнікумаўскіх ячэек па пытаньні становішча партработы і далейшых задачах; у пяцідзённы тэрмін прадставіць каляндарны плян па інструктаваньні і заслухоўваньні на бюро і сэкратарыяце ГК асобных ячэек ВУЗ'аў і тэхнікумаў;

д) ГК КСМ у дэкадны тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненьні работы камсамолу ў школах, тэхнікумах і ВУЗ'ах;

е) заслухаць даклад дырэктара пэдінстытуту аб выніках праверкі ведаў бедмовы сярод студэнтаў інстытуту.

8. Адзначаючы невыкананьне культпропам ГК, фракцыяй ГСПС, гарАНА і гарлітам пастаноў студзеньскага пленуму ГК аб сыстэматычнай прапагандзе ленінскай нацпалітыкі, масавай рабоце клюбаў і хат-чытальняў, аб ачыстцы бібліятэк ад ідэалёгічна-шкоднай літаратуры, абавязаць т. Зіноўева арганізаваць выкананьне гэтых пастаноў.

9. Нездавальняючае становішча марксыцка-ленінскага выхаваньня членаў і кандыдатаў партыі і КСМ зьяўляецца вынікам апартуністычнай недаацэнкі з боку раду парткалектываў і ячэек гэтага важнейшага участку партыйнай работы. Пленум патрабуе ад парт-арганізацыі ўзмацненьня штодзённага кантролю і кіраўніцтва гэтай работай.

Культпропу ГК пераглядзець склад прапагандыстаў, у мэтах забясьпячэньня сеткі партасьветы падрыхтаванымі і вытрыманымі кадрамі і ўстанавіць сыстэматычнае інструктаваньне іх.

10. Пленум абавязвае парткалектывы і ячэйкі, ГСПС, гарсавет, гарком КСМ і кіраўнікоў гаспадарчых устаноў павесьці самую рашучую барацьбу з ізврашчэньнямі практыкі правядзеньня беларусізацыі (прамая забарона карыстацца рускай мовай у звароце да дзяржаўных і іншых устаноў, прасьледваньне за рускую гутарку нават у прыватнай абстаноўцы) і яе мэханічным правядзеньнем і патрабуе ад усіх партыйных і савецкіх арганізацый сапраўды бальшавіцкага кіраўніцтва правядзеньнем беларусізацыі, улічваючы, што „аднэй з умоў далейшай пасьпяховай барацьбы з беларускім буржуазна-кулацкім нацыяналізмам зьяўляецца і надалей рашучае, неаслабнае правядзеньне справы беларусізацыі“.

11. Абавязаць нацкамісію, пад адказнасьць т. Кардатэнка, зрабіць рашучы пералом у перабудове работы нацкамісіі ў напрамку забясьпячэньня канкрэтнай дапамогі нізавым арганізацыям, устанаўленьня сталага кантролю і глыбокага вывучэньня асобных пытаньняў правядзеньня нацпалітыкі, рашуча прасякаючы факты фармальна бюракратычных адносін да гэтай справы.

Пленум абавязвае нацкамісію правесьці:

а) сталае вывучэньне становішча беларусізацыі ў раёне і ўзьняцьцё яе на вышэйшую ступень;

б) забясьпечыць абслугоўваньне насельніцтва дзяржаўным і інш. апаратам на роднай мове;

в) устанавіць сыстэматычнае вывучэньне і распрацоўку мерапрыемстваў у адносінах узмацненьня нацыянальных калгасаў, школ, тэхнікумаў, клюбаў і г. д.

Нацкамісіі прадставіць 11-га красавіка на бюро ГК плян сваёй работы.

12. У мэтах разгортваньня работы сярод працоўных нацменшасьцяў, правесьці:

а) фракцыі гарсавету і ГСПС унесьці на бліжэйшае паседжаньне бюро ГК мерапрыемствы па арганізацыі ў горадзе інтэрнацыянальнага клюбу;

б) культпропу ГК і фракцыі ГСПС забясьпечыць вытрыманымі і праверанымі кадрамі асобныя вучасткі работы сярод нацменшасьцяў (клюбы, школы, тэхнікумы, АЗЭТ і інш.);

в) заслухаць на бюро гаркому аб становішчы работы АЗЭТ, польскай і латыскай школ, а таксама заслухаць даклад камісіі, праверыўшай становішча нацыянальных рабочых школ дарослых;

г) гарбюро Саюздруку, парткалектывам і ячэйкам забясьпечыць прасоўваньне ў масы пэрыядычнай літаратуры на мовах нацменшасьцяў;

д) правесьці 8 красавіка раённую канфэрэнцыю працоўных палякаў, з мэтай узмацненьня інтэрнацыянальнага адзінства працоўных мас і мабілізацыі іх на барацьбу за бальшавіцкае ажыцьцяўленьне нацпалітыкі і выкананьне гаспадарчых задач першага году другой пяцігодкі.

13. Абавязаць рэдакцыю газэты «Віцебскі пралетары» і рэдактароў шматтыражак, радыёгазэты і насьценгазэт праводзіць штодзённую прапаганду асноў ленінскай нацпалітыкі, сыстэматычна асьвятляючы дасягненьні БССР і раёну ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, павесьці рашучую барацьбу супроць ізврашчэньняў нацпалітыкі, бязьлітасна выкрываючы і да канца разаблачаючы канкрэтных віноўнікаў гэтых ізврашчэньняў.

Культпропу ГК сумесна з рэдакцыяй «Віцебскага пралетара» правесьці нараду рэдактароў шматтыражак, насьценгазэт, рабселькораў па пытаньні ажыцьцяўленьня нацпалітыкі. Забясьпечыць выкананьне пастановы студзеньскага пленуму ГК аб сыстэматычным выпуску старонак на яўрэйскай, польскай, латыскай мовах, разгарнуўшы работу сярод рабселькораў нацменшасьцяў.

14. Адобрыць мерапрыемствы сэкратарыяту ГК аб умацаваньні аргкамітэту Саюзу савецкіх пісьменьнікаў, абавязаўшы культпроп ГК прыняць неабходныя меры па забясьпячэньні ўздыму творчай дзейнасьці пісьменьнікаў, разгортваньня масавай работы па арганізацыі літгурткоў на прадпрыемствах, у калгасах, савгасах, выхоўваньня падрастаючых кадраў пісьменьнікаў, рашуча выкрываючы і выпраўляючы памылкі ў іх рабоце. Абавязаць аргкамітэт і рэдакцыю газэты «Віцебскі пралетары» забясьпечыць сыстэматычнае выданьне зборнікаў твораў пісьменьнікаў і выпуск ня менш аднаго разу ў месяц літстаронкі.

15. Канстатуючы рад фактаў актывізацыі клясава-варожых элемэнтаў, выціснутых з асноўных тэатральных пазыцый і знайшоўшых прытулак у паасобных гурткох самадзейнага мастацтва, пленум даручае бюро гаркому распрацаваць адпаведныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі сталы нагляд і кіраўніцтва работай гурткоў, вытручваючы з іх практыкі пашляціну, абывательшчыну і ўзмацніўшы барацьбу з пратаскваньнем нацыяналістычных контррэвалюцыйных тэндэнцый, актывізаваць тэматыку гурткоў самадзейнага мастацтва, узьняць іх ролю ў барацьбе за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацпалітыку. Фракцыі ГСПС ажыцьцявіць рашэйшую дырэктыву гаркому аб канкрэтным шэфстве БДТ-2. ТРАМ, мастацкага і музычнага тэхнікумаў над гурткамі самадзейнага мастацтва.

Даручыць бюро гаркому прыняць рашучыя меры па палепшаньні становішча БДТ-2 і разгортваньні масавай работы па арганізацыі рабочага гледача і рабочай крытыкі.

16. Адзначаючы фактычнае невыкананьне асноўных рашэньняў студзеньскага пленуму гаркому КП(б)Б па нацпытаньні і фармальна-бюракратычнае правядзеньне адзінага партдню па выніках гэтага пленуму, аб'яднаны пленум катэгарычна патрабуе пакласьці канец самацёку, мэханічнаму і фармальным адносінам, расхлабанасьці і апартунізму ў такой важнейшай справе партыі, як ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі. Пленум абавязвае бюро гаркому і прэзыдыум гарКК сыстэматычна правяраць і заслухоўваць справаздачы асобных выканаўцаў аб выкананьні імі асобных даручэньняў партыі, у прыватнасьці даннай пастановы.

Пленум патрабуе ад усіх партыйных, савецкіх, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый штодзённай, канкрэтнай і апэрацыйнай работы ў правядзеньні нацпалітыкі, кладучы ў аснову ўсёй гэтай работы палітыку «зближэньня пралетараў і поўупралетараў розных нацыянальнасьцяў для сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы» (з праграмы УсеКП(б), завайстрае ўвагу партарганізацыі на тым, што «посьпехі далейшага ажыцьцяўленьня ленінскай нацпалітыкі знаходзяцца ў прамой залежнасьці ад таго, наколькі кожная партарганізацыя, кожны камуніст усьвядомяць тое новае, што ёсьць зараз у клясавай барацьбе ўнутры краіны, наколькі яны здолеюць з яшчэ большай непрымірымасьцю і пасьлядоўнасьцю змагацца за прынцыпы пралетарскага інтэрнацыяналізму ў правядзеньні нацпытаньня». (З пастановы пленуму ЦК і МГК КП(б)Б).

ДАПАМОЖАМ КААПГАСАМ ПРАВЕСЬЦІ СЯЎБУ.

ДАЎЖАНСКІЯ, РУДНІЦКІЯ, БАРАЎЛЯНСКІЯ І СТАРАСЕЛЬСКІЯ КААПЭРАТАРЫ НЯ ВЫКОНВАЮЦЬ СВАІХ АБАВЯЗКАЎ.

Загатовіць і даставіць насенбульбу—справа гонару сельскіх каапэратараў.

ПЛЁНЫ АПАРТУНІСТЫЧНАГА САМАЦЁКУ.

ШУМНЯНСКАЕ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВА І РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ НЕ АРГАНІЗАВАЛІ РАБОТУ ПА ЗАКУПЦЫ БУЛЬБЫ.

ШУМНЯНЫ (ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

На долю Шумнянскага сельСТ выпала закупіць 12 тон бульбы. На вялікі сорам шумнянскіх каапэратараў, яны яшчэ ніводнага кілёграму бульбы не загатовілі. Старшыня сельСТ Зубрыцкі і прадстаўнік райспажыўсаюзу Юшкевіч гэтае справы не арганізавалі.

Пайшлі каапэратары ў калгас «Новы сьвет» загатаўляць бульбу. Ну, і загатовілі... 4 пуды і тую яшчэ не атрымалі. Калгасны актыў на гэтую справу не мабілізаваны. Кулацкім разважаньням з боку старшыні калгасу «Новы сьвет» Драгасэннага «я лепш 20 пудоў калгаснай бульбы прадам на рынку па 30 руб.» ня далі рашучага адпору. У рэзультаце такіх разважаньняў закупку бульбы па калгасе «Новы сьвет» і сярод калгасьнікаў праваліли, а Зубрыцкі і Юшкевіч з гэтым прымірыліся.

Хіба гэта не гаворыць аб апартуністычных адносінах да справы закупкі бульбы?! Куды гэта варта, калі сельсавет адносіну аб удзеле калгасаў і калгасьнікаў аб продажы бульбы разаслаў толькі 30 сакавіка, а пра ўдзел аднаасобнікаў нават яшчэ і не гаварыў.

Апартуністычнай недаацэнцы справы выкананьня баявога заданьня павінен быць нанесен сакрушальны ўдар. 12 тон бульбы ў тэрмін павінны быць закуплены, усе магчымасьці для гэтага ў сельсавеце маюцца.

Рыг. Вярхоўскі.

ЧОРНАЯ ДОШКА.

За зрыў пляну загатовак насеннай бульбы заносім на чорную дошку наступныя сельскія спажывецкія таварыствы:

ДАЎЖАНСКАЕ (старшыня праўленьня сельСТ Крыўцоў).

РУДНІЦКАЕ (старшыня праўленьня сельСТ Таркоўскі).

БАРАЎЛЯНСКАЕ (старшыня праўленьня сельСТ Гурэвіч).

СТАРАСЕЛЬСКАЕ (старшыня праўленьня сельСТ Маслакоў).

СПАБОРНІЦТВА ТРОХ РАЁНАЎ: МЕНСК, ВІЦЕБСК, ГОМЕЛЬ.

УСЕ ГАЛІНЫ ГАСПАДАРКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ГАТОВЫ!

З-ЗА ДРЭННАЙ ВАЖЖЫ І СУПОНЬНІ, З-ЗА АДСУТНАСЬЦІ ЯКОЙ-НЕБУДЗЬ ГАЙКІ. МОЖА БЫЦЬ АСТАНОЎКА НА СЯЎБЕ. ГЭТА ТРЭБА ЎЛІЧЫЦЬ ЗАРАЗ.

Барацьба за высокі ўраджай—справа кожнага калгасьніка.

Калгас „Пабеда", В.-Лётчанскага сельсавету, выканаў план вывазкі гною толькі на 14 проц. Старшыня і члены праўленьня калгасу зусім забылі, што гной—лепшы сродак падвышэньня ўраджайнасьці і справу гэту зусім закінулі. Брыгадзіры, зьяўляючыся на работу з вялікім спазьненьнем, зрываюць вывазку гною ў сваіх брыгадах. Вось, напрыклад, 20 сакавіка брыгадзір брыгады № 1 Іваноў спазьніўся на работу і калгасьнікі пачалі работаць толькі а 2 й гадзіне дню.

У брыгадзе № 2 за ўвесь дзень вывезена гною толькі 20 вазоў. Гэтай брыгадай „кіруе" Салаўёў, два месяцы таму назад зьняты з работы за безгаспадарчасьць. Яшчэ горш стаіць справа са зборам попелу. Адказнага за гэты вучастак работы няма. Сабрана ўсяго толькі 1,5 тоны.

Кожны калгасьнік павінен уцяміць, што барацьба за высокі ўраджай—яго непасрэдная справа. Мабілізаваць усе сілы і сродкі на ліквідацыю прарыву ў вывазцы ґнаеньня.

Рыг. Васільлеў.

Чаму ня прымаюць ніякіх мер МТС і Бабініцкі сельсавет?

Калгас «Другая пяцігодка», Бабініцкага сельсавету, як самастойная гаспадарчая адзінка, існуе ўсяго 3 месяцы, раней зьяўляючыся часткай зараз разьбуйнёнага калгасу імя Молатава. Ліквідацыйная камісія па разьбуйненьні калгасу імя Молатава ў складзе: Янушэвіча, Бугаева, Яшчанкі і Дубішкі цягне справу з перадачай маёмасьці каля 3-х месяцаў Яшчэ калгасу не перададзена азімае жыта, засыпанае ўзамен нехапаючага насеньня яравых культур, не перададзен корм, інвэнтар, частка жывёлы. А такое становішча, бязумоўна, адбілася і на падрыхтоўцы калгасу да сяўбы.

Трэба з усёй рашучасьцю заявіць, што калі ня будуць прыняты належныя меры да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня гэтага калгасу, веснавая сяўба ў калгасе можа апынуцца пад падгрозай зрыву. Не хапае 215,15 цэнтнэра насеньня. Асабліва востры недахоп вікі—65,69 цэнтнэра і аўсу да вікі—91,72 цэнтнэра Не хапае гароху і ільнонасеньня. Ніякіх рашучых захадаў да набыцьця насеньня праўленьнем калгасу ня прынята. Засыпанае азімае жыта не абменьваецца, бо старшыня калгасу Федарэнка ня ведае колькі жыта яму трэба ўзяць ад калгасу імя Молатава. Частка насеньня занадта засьмечана. Гарох засьмечаны на 31,3 проц., насеньня, гожага для культурнага росту, усяго 55 проц. Процант прарастаньня аўсу нізкі, чыстата аўсу ўсяго 34 процантаў.

Катастрафічнае становішча з вывазкай гною. Замест 3500 вазоў па пляне, вывезена толькі 1004. Аб вывазцы гною з гораду кіраўніцтва калгасу зусім ня думае. Больш таго, загадчык гаспадаркай Дзянісёнак апартуністычна разважае: «Везьці нельга, далёка, дый гною ў горадзе няма, а вось падвязуць мінэральнае». Гэтае „авось" і «наогул» чырвонай істужкай праходзяць праз усю лінію кіраўніцтва, і прывяло калгас да прарываў. У калгасе няма пастаянных вытворчых брыгад, ня ўведзен севазварот, ня ведаюць, дзе што сеяць. Вучасткоўы агранам Эгліт, на абавязку якой ляжыць непасрэдная практычная дапамога гэтаму найбольш адстаючаму калгасу, сюды ніколі не заглядае. Калгас нават ня мае ўстойлівага землекарыстаньня, а каморніка ня бачна з пачатку арганізацыі калгасу.

Факты з усёй яскравасьцю сьведчаць, што калгас «Другая пяцігодка» пакінут на волю лёсу Кіраўніцтва сельсавету і МТС, якія абслугоўваюць калгас, поўна думаюць, што апартуністычны самацёк вырашыць справу, адсюль поўнае адсутнічаньне кіраўніцтва.

Калгас «Другая пяцігодка» патрабуе штодзённага, аперацыйнага бальшавіцкага кіраўніцтва. Толькі тады ён здолее выйсьці з глыбокага тылу гавебнага адставаньня ў падрыхтоўцы да сяўбы.

С. Раскін.

Выправіць памылкі на хаду.

Прадпысцыпліна сярод калгасьнікаў калгасу імя Будзёнага, Шумнянскага сельсавету, не знаходзіцца на належнай вышыні. Гэта адчуваецца ўвесь час у рабоце і асабліва поўна гэта выявілася на пробным выезьдзе. Замест 10 гадзін раніцы першая брыгада (брыгадзір Казлоў) зьявілася ў 11 гадзін, а другая (брыгадзір Лісянкоў) у 10 з палоўай. Плугі яшчэ ня ў поўнай спраўнасьці, няправільна сабраны. Аралельныя хамуты ў першай брыгадзе ня былі падагнаны да двух коняй, у другой брыгадзе —да трох коняй.

Становішча конскага пагалоўя катастрафічнае: з маючыхся 38 коняй—32 нізкай упітанасьці, худыя, большая палова слабасільны. 2 кані ледзь трымаюцца на нагах.

Старшыня праўленьня калгасу Пляшкоў замест таго, каб увесь час рыхтавацца па-баявому да сяўбы, праяўляе бязьдзейнасьць, не рэагуе на разгільдзяйства, лодырнічаньне, драпежніцкія адносіны да каня, на ганебныя факты, якія выявіліся ў час выезду.

Трэба зараз-жа прыняць рашучыя крокі па аздараўленьні работы калгасу, на хаду выправіць недахопы, забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы.

Рыг. Вярхоўскі.

З ПОШТЫ „ВІЦЕБСКАГА ПРАЛЕТАРА".

Палац працы, 3-ці паверх.

„Мы ня ведаем ні сваіх заданьняў, ні вучасткаў"... А ЧЫМ-ЖА ЗАЙМАЕЦЦА ВІЦЕБСКАЯ МТС?

(Ліст трактарыста).

Як мы, трактарысты Віцебскай МТС, падрыхтаваліся да сяўбы першага году другой пяцігодкі. Праўда, атрымоўвалі практыку ў майстэрвях МТС, глядзелі як рамонтуюць трактары. Арганізаваныя курсы па вывучэньні тэорыі папрацавалі ўсяго толькі 3 дні і распаліся. Да гэтага часу мы ня ведаем ні сваіх вучасткаў, ні іх загадчыкаў.

Трактары, як быццам, ужо гатовы і інвэнтар разьвезены па вучастках, а як яны будуць работаць—невядома, бо праверкі ня было. Трэба хоць у застаўшыяся лічавыя дні ўзброіць трактарыстаў неабходнымі ведамі і азнаёміць з заданьнямі па сяўбе.

Калёнаважаты, дэлегат усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

ІВАНОЎ С.

АД РЭДАКЦЫІ Ліст трактарыста калёнаважатага тав Іванова С. сьведчыць аб тым, што з падрыхтоўкай кадраў трактарыстаў на віцебскай МТС неблагапалучна Ці можа МТС заявіць аб сваёй гатоўнасьці да сяўбы, калі ж трактарысты дрэнна падрыхтаваны тэарэтычна і практычна і калі яны яшчэ зараз ня ведаюць сваіх вытворчых заданьняў і вучасткаў работы?

„Віцебскі пралетары" чакае ад партячэйкі і кіраўніцтва МТС паведамленьня па сутнасьці ліста.

Кулацкі Хлестакоў у калгасе „Чырвоны Кастрычнік".

(Ліст калгасьніка).

У калгас «Чырвоны Кастрычнік», Машканскага сельсавету, 26 лютага 1933 г. у брыгаду Малая Рамшчына зьявіўся для рэвізіі старшыня рэвкамісіі (ён-жа загадчык Машканскай сямігодкі)—Масьлякоў. Зараз-жа запрагаюць калгаснага каня і замест рэвізіі едуць у Задароскі каапэратыў за віном. Узяўшы 3 літры, пачынаюць п'янку, у якой удзельнічаюць: кладаўшчык калгасу Саўчанка Лявон, брыгадзір Грыбкоў Н. і калгасьнікі—Ясінскі Антон, Лац Гавна і інш. Напіўшыся, едуць на калгасным кані катацца, заяжджаюць да інструктара палітэхнізацыі школы Пажарынскага і там зноў напіваюцца. Адтуль з п'янымі выкрыкамі ў складзе 7 чалавек «рэвізоры» падъяжджаюць да будынку школы. Аставіўшы там старшыню рэвкамісіі Масьлякова, Грыбкоў і Саўчанка едуць на гэтым-жа калгасным кані катацца і зварачваюцца, «пракатаўшыся» 14 гадзін, як кажуць «удрызг» п'яныя А «рэвізор» Масьлякоў выспаўся і ідзе на стайню патрабаваць калгаснага каня ехаць дамоў. У гэты час зьявіўся брыгадзір Лац, які забараніў запрагаць ноччу калгаснага каня, але-ж «рэвізор» упэўніў яго запіскай у тым, што ён прыяжджаў па «рэвізіі» калгасу і школы, усё знайшоў у парадку і павінен зараз жа ўехаць. Яму далі каня. На другі дзень пасьля такой «рэвізіі» ён не зьявіўся на заняткі ў школу.

Гэтыя дэбашыры павінны панесьці адказнасьць за такія адносіны да працы і да калгаснай маёмасьці.

Калгасьнік П.

Ад рэдакцыі. „Віцебскі пралетары" чакае ад Машканскага сельсавету і пракуратуры расьсьледваньня прыведзеных у лісьце фактаў і падрабязнага паведамленьня па лісту.

Ці так трэба рыхтаваць кадры?

(Ліст курсанта).

1-га сакавіка пры дарбудвучы адчыніліся вопытна-паказальныя курсы шофэраў на 100 асоб. Як паказалі першыя дні, адміністрацыя курсаў зусім не падрыхтавалася да прыёму курсантаў: ня было памяшканьня для заняткаў, не ўкамплектаван штат выкладчыкаў і дзень не запоўнен вучобай. Напрыклад, 6-га сакавіка —3 лекцыі матэматыкі і больш нічога, 8-га сакавіка—2 лекцыі мэханікі, 10-га сакавіка—і 2 матэматыкі, 11 га—3 лекцыі па аўтасправе г. д. Адсутнічаюць падручнікі паспэцыяльных дысцыплінах, як аўтасправа, тэхналёгія і інш Вучням прыходзіцца ўлаўліваць веды толькі з лекцыі. У школе няма наглядных дапаможнікаў.

Спачатку абяцалі стыпэндыю ня менш 100 рублёў, альбо сярэдні заробак, зараз-жа гавораць аб 60 рублёх, нават 45 руб, з прычыны чаго пачаўся адсеў курсантаў. Такое становішча зрывае падрыхтоўку кадраў, у якіх мы на сёньняшні дзень маем вялікую патрэбу.

Курсант Рэўф

АД РЭДАКЦЫІ. „Віцебскі пралетары" чакае ад загадчыка курсаў тав. Багданава і арганізатараў гэтых курсаў паведамленьня па лісту.

Вары крадуць, а праўленьне маўчыць.

(Ліст калгасьнікаў).

У калгасе імя Будзёнага, Шумнянскага сельсавету, не надаецца належнай увагі пытаньню аховы маёмасьці. Вары крадуць, а іх пакрываюць, бо праўленьне маўчыць. Брыгадзір 2-й брыгады Сянькоў Васіль краў калгаснае жыта і прадаваў свайму брату Цімоху па 65 руб. за пуд, часткова за грошы і прамтавары, а часткова за гарэлку. Таксама ён прадаваў Цімоху мякіну і Глячкову А.—авёс.

Шмат шкодніцтва ёсьць і ў другім напрамку. Калі далі плян сіласаваньня, то Сянькоў засіласаваў з 1,5 га сланечніку, не парэзаўшы яго, у той час, калі па нарадах праведзена за рэзку каля 20 працадзён. Убранае ў мінулым годзе з чатырох га сена згніла і пайшло на падсьцілку жывёле. Нават тое сена, якое зьвезена было своечасова, склалі на гной і ня дзіва, што ў брыгадзе № 2 коні прыстаюць з-за недахопу добраякаснага корму. Па калгасе зараз маецца недахоп насеньня на 70 цэнтн., бо пры першым абмалоце гароху Сянькоў раздаў без усялякага вучоту 10 цэнтн. Таксама пры пераворваньні 12 га бульбянішча, бульба раздавалася калгасьнікам без усялякага ўліку.

Працадні Сянькоў улічваў каму як хацеў. Маецца шмат выпадкаў, калі некаторым калгасьнікам улічваліся працадні і, акрамя гэтага, аплачвалася натурай, як, напрыклад, Французаву—за ачыстку сараю для малацьбы ўлічаны і працадні і дадзена 10 пудоў бульбы. Вядома і тут бяз поўлітра не абыйшлося.

Другі шкоднік—Лебедзева С.—увесь час вяла агітацыю сярод калгасьнікаў, каб разьмеркаваць ільномякіну. Акрамя гэтага, яна вяла агітацыю сярод калгасьнікаў, каб бралі лепшае кармовае жыта, а горшае пакінуць у насенны фонд.

Трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці вароў калгаснай маёмасьці і моцна ўдарыць па іх укрываделях.

Група калгасьнікаў.

АД РЭДАКЦЫІ. Мы палкам падтрымліваем патрабаваньне калгасьнікаў калгасу імя Будзёнага аб прыцягненьні да адказнасьці ня толькі вароў, але і тых, хто іх пакрывае. Аб задавальненьні гэтага законнага патрабаваньня калгасьнікаў павінна паклапаціцца пракуратура.

Сыгналы не пачуты.

(Ліст настаўніка).

Праграмы агразоотэхгурткоў і курсаў, дасланыя сельска-гаспадарчым аддзелам гарсавету сельсаветам, складзены дрэнна, бяз уліку спэцыфікі паасобных калгасаў і брыгад (конюх слухае лекцыі аб паляводзтве, а паляход—па доглядзе каня). Аб тым, што праграмы не адпавядаюць задачам агразоопрапагавды ведае і гарком партыі і сельска гаспадарчы аддзел гарсавету, але рэальных крокаў да выпраўленьня праграм ня зроблена.

Сыгналы з месц аб няпрыгоднасьці праграм учашчаюцца, трэба тэрмінова іх перагледзіць.

А. П.

АД РЭДАКЦЫІ.

28 лютага г. г. мы пісалі аб няпрыгоднасьці праграм, дасланых па сельсаветах. Нас вельмі зьдзіўляе, чаму прэзыдыум гарсавету і РСІ не ўмяшаліся ў справу падрыхтоўкі калгасных кадраў, аставілі гэты артыкул без рэагаваньня.

Паабяцалі і.. забыліся.

(Ліст настаўніка).

У мінулым годзе мы скончылі кароткатэрміновыя курсы. Для таго, каб павысіць сваю кваліфікацыю, мы падалі заявы на завочнае навучаньне Нас прынялі. Добракваліфікаваныя настаўнікі ўзялі над намі шэфства, абяцаўшы нам дапамагчы мэтадычна і практычна. Але ўсё гэта засталося абяцаньнем. Зараз настаўнікі шэфы нам дапамогі ніякай не аказваюць. Ад устаноў па завочным навучаньні нічога ня чутна. Мінула больш паловы году, а мы нават заданьне для заняткаў не атрымалі. Напэўна забылі, што ў Машканах ёсьць завочнікі.

Сімакоўская ШКМ,
Машканскага сельсавету.

Мяжэвіч.

АД РЭДАКЦЫІ. ГарАНА павінна стварыць умовы настаўнікам выпуску мінулага і гэтага году в тым, каб яны маглі работаць над сабою, павышаць свае тэарэтычныя веды.

Шэфтаварыствам фабрык і заводаў Віцебску.

Сёньня шэфарганізацыі прадпрыемстваў прапрацоўваюць сярод рабочых выні кі першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў і заклік рабочых маскоўскага заводу імя Ільліча аб уключэньні ва ўсесаюзнае спаборніцтва шэфскіх баз на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы (зьмешчан у газэце „Труд" ад 5 красавіка 1933 г).

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ.

СЁНЬНЯ—ВЕЧАР МОПР-аўцаў.

Сёньня, 9 га краса іка, роўна ў 6½ гадз. увечары, у памяшканьні Белдзяржтэатру адбудзецца **масавы інтэрнацыянальны вечар МОПР-актыву.**

Білеты атрымаць па сьпісе ячэек МОПР у ГК МОПР (Палац працы, пакой № 7).

Сёньня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Палацу Працы (пакой № 11) склікаецца **ПАШЫРАНЫ СХОД ПАРТЫЙНА КАМСАМОЛЬСКАГА, ПРАФСАЮЗНАГА і АСОАВІАХЭМАЎСКАГА АКТЫВУ** па пытаньні перавыбараў саветаў і ячэек Асовіахэму.

Абавязкова павінны зьявіцца сэкратары калектываў і ячэек КП(б)Б, ЛКСМБ, старшыні ФЗМК і старшыні саветаў і ячэек Асовіахэму.

Агітмас гаркому КП(б)Б
Гарпрафсавет,
Гарсавет Асовіахэму.

— Сёньня, а 6-й гадзіне ўвечары, у габінэце сэкратара гаркому КП(б)Б адбудзецца нарада дырэктароў, сэкратароў партколектываў і старшынь ФЗК прадпрыемстваў, маючых свае прыгарадныя гаспадаркі, дырэктароў гэтых гаспадарак і ўпаўнаважаных гаркому.

ГК КП(б)Б.

— Сёньня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні вялікай залі ГК КП(б)Б адбудзецца нарада сэкратароў ячэек і парткалектываў, дырэктароў прадпрыемстваў, старшынь ФЗМК, камуністаў і камсамольцаў, працуючых у школах, па пытаньні аб становішчы ліквідацыі непісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод рабочых. На нараду таксама павінны зьявіцца т. т.: Левіна (гарпрафсавет), Старобінец, Генін, Масарсі (ГК КСМ), Розэнблюм (рэд. „Віц. пралетара"), Мэклер, Пятроў (саюз працасьветы) Яўка абавязкова.

Культпроп ГК КП(б)Б.

— 11 красавіка, а 6 й гадз. увечары, у памяшканьні гаркому КП(б)Б (пакой № 17), склікаецца НАРАДА СЭКРАТАРОЎ ПАРТЯЧЭЕК, ДЫРЭКТАРОЎ, СТАРШЫНЬ ЗАВКОМАЎ (камуністаў), сэкратароў камсамольскіх ячэек цагельных зав даў 1, 2, 5. 13, вапняных заводаў „Вярхоўе" і Руды", заводу блёчных каменьняў, п пытаньняхъ партмасавай работы і падрыхтоўкі да сэзону.

Пэрсанальна запрашаюцца тт.: ГАРЭЛІК, МОІН (гарсавет), СТАРОБІНЕЦ (ГК ЛКСМ), ЛЕВІНА (ГСПС).

Гарком КП(б)Б.

13 красавіка, а 10 гадз. раніцы, у памяшканьні ГК КП(б Б (пакой № 17) склікаецца НАРАДА СЭКРАТАРОЎ, КАЛГАСНЫХ, САВГАСНЫХ І СЕЛЬСАВЕЦКІХ ЯЧЭЕК КП(б)Б І КСМ па пытаньні партмасавай і камсамольскай работы ў час севу.

На нарадзе будуць заслуханы даклады сэкратароў ячэек аб пастаноўцы партмасавай работы ў сувязі з севам.

Яўка сэкратароў ячэек КП(б)Б і КСМ абавязкова.

ГК КП(б)Б ГК ЛКСМБ.

ДЗЯРЖЦЫРК. З 10-га красавіка ТОЛЬКІ 6 ГАСТРОЛЯЎ
КІТАЙСКАГА НАРОДНАГА ЦЫРКУ.
ЖАНГЛЁРЫ, БАЛАНСЁРЫ, людзі мячыкі, ілюзыяністы Сусьветны рэкорд ПАЛЁТ НА КАСЕ бр. Маліноўскія (паветраныя гімнасты). Мак і Стэфані (падвоны палёт), Стэфані (комік жанглёр) і многа іншых нумароў. Пачатак а 9 гадз увечары. Каса адчынена з 12—3 і з 5—9 гадз. увечары Прымаюцца заяўкі на калектыўнае наведваньне.

Сёньня, 9-га красавіка, а 6 гадз, у клюбе будаўнікоў адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД
членаў саюзу групкому № 27, па пытаньні рэарганізацыі групкому. Яўка ўсіх рабочых абавязкова без спазьненьня
322—1—1 Групком № 22.

Прыём на 8-МЕСЯЧНЫЯ ПЭДКУРСЫ ПРАЦЯГВАЕЦЦА ДА 20-га КРАСАВІКА
Заявы прымаюцца ў гарАНА.
318—3—1

АРГ.-МАСАВЫ АДДЗЕЛ ГАРСАВЕТУ 11-га КРАСАВІКА, А 7 ГАДЗ УВЕЧАРЫ, у памяшканьні Палацу працы (пакой №11) склікае зьлёт дэпутацкіх груп і сэкцый, з удзелам дырэктароў і намдырэктароў прадпрыемстваў, маючых прыгарадныя гаспадаркі. усіх дырэктароў капгасаў, ЗРК, ЗВК, ЦРК, прадстаўнікоў гарпрафсавету, гарснабу і сельска гаспадарчага аддзелу гарсавету па пытаньні аб становішчы падрыхтоўкі прыгарадных гаспадарак да веснавой сяўбы.
316—3—1 Арг. масавы аддзел гарсавету.

ЗА ГРАНІЦАЙ.

Масавыя аблавы і арышты ў Германіі.

БЭРЛІН, 6 красавіка. (ТАСС). Сёньня раніцай каля 500 паліцэйскіх, 100 нацыянал-сацыялісцкіх штурмавікоў і шматлікія агенты палітычнай паліцыі ацапілі рабочы пасёлак Рэйнікендорф (паўночная частка Бэрліну). У аблаве прымаў удзел таксама атрад паліцэйскіх на мотацыклах і 2 аўтамабілі, на якіх устаноўлены радыё станцыі.

Па словах вячэрняй «Локаль анцэйгер», паліцыя шукала ў Рэйнікендорфе „антыдзяржаўныя друкаваныя матар'ялы". У рэзультаце аблавы, якая працягвалася каля 4-х гадзін, паліцыя, па словах «Локаль анцэйгер», знайшла «антыдзяржаўныя матар'ялы». Жыхары бараказ, на тэрыторыі якіх знойдзены гэтыя „матар'ялы", арыштаваны.

Агенцтва Вольфа паведамляе з Любеку, што там за апошнія дні паліцыя і дапаможная паліцыя ўтварылі звыш 400 вобыскаў у палітычна надобранедзейных асоб. Арыштавана 53 чал., па словах паведамленьня—галоўным чынам актывістаў кампартыі і с.-д. партыі.

Надзвычайны суд у Эсене прыгаварыў сьлесара Фоса з Гельзэнкірхэна да 6 год катаргі. Фос абвінавачваўся ва ўдзеле ў сутычцы з нацыянал-сацыялістамі.

Прускі міністр унутраных спраў выдаў распараджэньне аб тым, што ўперад урачы, аптысты і фармацэўты—чужаземцы, нават у тым выпадку, калі яны скончылі германскі ўніверсытэт, не павінны атрымаць права практыкаваць у Германіі.

Стачка францускіх гарнякоў.

ПАРЫЖ, 5 красавіка (ТАСС). Абвешчаная рэфармісцкімі прафсаюзамі гарнякоў усеагульная трохдзённая забастоўка гарнякоў ахапіла рад вугальных раёнаў, у прыватнасьці тых, дзе ўнітарныя (рэвалюцыйныя) прафсаюзы карыстаюцца пераважным уплывам і вядуць актыўную работу.

Так, у паўночным раёне Эскарпель бастуюць усе гарнякі па ўсіх шахтах, за выключэньнем адной. У Дуйі забастоўка ахапіла амаль усіх рабочых.

У радзе пунктаў утвораны камітэты прафсаюзнага адзінства. У Энэн-Льетар на мітынгу, у якім удзельнічала 3 тыс. гарнякоў, пасьля выступленьня рэфармісцкага прамоўцы, прадстаўнік унітарнага прафсаюзу Франшон выклаў зьмест прапановы ўнітарнай канфэдэрацыі працы аб пашырэньні забастоўкі і працягваньні яе ўперад да здавальненьня ўсіх асноўных трэбаваньняў гарнякоў.

Мітынг адзінадушна адобрыў выступленьне Франшона.

НА ВЫСОКІМ ПАЛІТЫЧНЫМ УЗРОЎНІ ПРАВЯДЗЕМ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ГАРАДЗКОЙ КАНФЭРЭНЦЫІ АЎТАДОРУ.

На аўтадораўскую арганізацыю партыі ўрадам ўскладзены вялікія задачы, вузлавая іх: садзейнічаць разьвіцьцю аўтамабілізацыі трактарызацыі і дарожнага будаўніцтва СССР. Віцебская арганізацыя Аўтадору раней не спраўлялася з гэтымі задачамі з прычыны бязьдзейнасьці яе кіраўніцтва. Толькі за апошні час, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву гарадзкога камітэту партыі і канкрэтнай дапамогі з боку ўсёй грамадзкасьці мы дасягнулі значных посьпехаў. рост членства Аўтадору, актывізацыя аўтадораўскай работы на прадпрыемствах і ў калгасах. удзел аўтадораўскай арганізацыі ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, збор попелу, вывазка гною, арганізацыя гаспадарча разрахунковых брыгад па рамонце сельска гаспадарчага інвэнтару, дапамога ў выпуску запчастак на заводзе „Чырвоны мэталіст", аўтабазе і інш.

Ці можам мы зараз застанавіцца на такіх незначных кроках, якія мы зрабілі ўперад? Не, ні ў якім разе!

У час падрыхтоўкі аўтадораўскіх арганізацый да сваёй канфэрэнцыі мы павінны зрабіць карэнны пералом ва ўсёй сваёй паўсядзённай рабоце. Нашы задачы ў сучасны момант заключаюцца ў тым, каб перагарнуць грамадзкую аўтадораўскую арганізацыю, прамы прывадны пасэнт партыі да мас, ці прыйсьці да гарадзкой канфэрэнцыі патрэбнымі радамі, яшчэ больш актывізаваць удзел у падрыхтоўцы да першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі; праверыць становішча аўта-трактарнага парку, яго гатоўнасьць да сяўбы і свайім практычным удзелам і дапамогай дабіцца поўнай і своечасовай апрацоўкі глебы трактарамі. Змагацца за тое, каб ніводны трактар не вышаў са строю ў час пасеўнай і ўборачнай кампаніі.

Дабіцца максымальнай эканоміі гаручага змазачнага.

Адрамантаваць да пачатку пасеўнай усе падъязныя шляхі і масты.

Змагацца за якасны склад шофэраў і трактарыстаў, ачышчаючы рады шофэраў і трактарыстаў ад вацясаўшыхся чужда-клясавых элементаў.

Кожны вытворчы калектыў і ячэйка Аўтадору павінны арганізаваць у сваіх падшэфных калгасах аўтадораўскую ячэйку да гарадзкой канфэрэнцыі, мабілізаваўшы іх увагу на выкананьне ўсіх абавязкаў якія ўскладзены на аўтадораўскую арганізацыю.

Зараз-жа пачаць падрыхтоўчую работу па дарожнага будаўніцтва дзяржаўных і мясцовых дарог, сваім канкрэтным удзелам і практычнай работай дабіцца поўнага і своечасовага выкананьня плянаў дарбудаўніцтва 1933 году.

Правядзем па баявому, сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі рэалізацыю 4-й усесаюзнай пяцігодкі Аўтадору, выканаем і перавыканаем гадовы вызначанага тэрміну кантроль ныя лічбы, дадзеныя віцебскай арганізацыі, да 1 га чэрвеня 1933 году.

Умацуем аўтадораўскую арганізацыю правераными, праверанымі кіраўнікамі.

Партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі на мясцох павінны дапамагчы аўтадораўскім ячэйкам у іх паўсядзённай работе і канкрэтна імі кіраваць, выдзеліць на гэту работу лепшых, правераных камуністаў і камсамольцаў.

МАЁРАЎ.

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Кінгісэпік № 19 Друкарня „Камінтэрн". Калгасьніка, 10. Тыраж 3.500 экз.